# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны

«Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава»,

прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Дысертацыйнае даследаванне Дзігадзюк В.П. прысвечана вывучэнню моўнай рэпрэзентацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава. Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання вызначаецца накіраванасцю на тэарэтычнае асэнсаванне рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў лінгвістыцы, а таксама адсутнасцю ў сучасным беларускім мовазнаўстве спецыяльных прац, прысвечаных аналізу моўных сродкаў выражэння праспекцыі і рэтраспекцыі, кваліфікацыі іх тыпаў, відаў, адносін паміж кампанентамі.

Дысертацыя выканана ў межах навуковых тэм «Слово, образ, текст в современной парадигме знаний: лингвистический, литературоведческий и дидактический аспекты» (2016 – 2020 гг.); «Кагнітыўна-дыскурсіўная структура мастацкага тэксту: семантыка-сінтаксічныя і лексіка-граматычныя асаблівасці» (2021 – 2025 гг.), што сведчыць пра несумненны ўклад даследавання ў тэарэтычную базу беларускай лінгвістыкі.

Навізна дысертацыйнага даследаваня заключаецца ў тым, што дысертантам былі выкарыстаны метадалагічныя прынцыпы лінгвістыкі тэксту, а таксама сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці мастацкага твора былі ўзяты ў якасці параметраў тыпалогіі праспекцыі і рэтраспекцыі. Гэта адкрыла перспектывы для стварэння новай тыпалогіі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў беларускім мовазнаўстве. Аналіз лінгвістычнага аб’екта праводзіўся на багатым і арыгінальным фактычным матэрыяле, які ўключае 7 раманаў У. Гніламёдава, у мове твораў якіх выразна адлюстроўваецца шырокі дыяпазон тыпаў, відаў і значэнняў аналізуемых з’яў.

У адпаведнасці з мэтай і задачамі даследавання ў дысертацыі сфармуляваны асноўныя палажэнні, што выносяцца на абарону, якія падпарадкаваны агульнай канцэпцыі дысертацыі, характарызуюцца навізной, навуковай абгрунтаванасцю і пацвярджаюцца зместам работы.

Хочацца звярнуць увагу на распрацоўку аўтарам дысертацыі сістэмы комплекснага аналізу тэкставых катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў беларускай мастацкай прозе, якая пацвярджаецца надзейнай метадалагічнай базай і тэарэтычнымі асновамі лінгвістыкі тэксту. Падобны падыход дазволіў стварыць новую сістэму ўпарадкавання катэгорый мастацкага тэксту ўцэлым, праспекцыі і рэтраспекцыі ў прыватнасці.

Вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 14 публікацыях, якія ўключаюць 7 артыкулаў у рэцэнзаваных перыядычных выданнях, 3 артыкулы ў зборніках навуковых прац і навуковых часопісах, 4 публікацыі ў зборніках навуковых і навукова-метадычных міжнародных і рэспубліканскіх

канферэнцый, што дазваляе зрабіць вывад аб паўнаце выкладу навуковых вынікаў даследавання.

Відавочна, што факталагічная база даследавання грунтоўная (1463) і верагоднасць вынікаў дысертацынага даследавання не выклікае сумненняў. Пры гэтым хацелася б пачуць дадатковае тлумачэнне адносна непрапарцыянальнасці з'яў праспекцыі ў раманах У. Гніламедава (308 блокаў) і рэтраспекцыі (1155 блокаў). Чым абумоўлена такая розніца ў рэпрэзентацыі з'яў?

Аналіз аўтарэферата дазволіў зрабіць высновы, што дысертацыйнае даследаванне адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да работ падобнага тыпу -- прадмет і аб'ект даследавання, асноўныя палажэнні, вынесеныя на абарону, навуковая інтэрпрэтацыя фактычнага матэрыялу адпавядаюць спецыяльнасці і галіне навук, па якіх дысертацыя прадстаўлена да абароны. А аўтар дысертацыі заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Загадчык кафедры беларускай
і рускай моў установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Т.М.Мельнікава

Учреждение образования «Белорусский государственный медицинский университет» ОТДЕЛ КАДРОВ

Подпись Мельниковой Т.Н. удостоверяю

Ермачёнок М.А.